**І.І.Бамбешка,** *старшы выкладчык,*
*Беларускі дзяржаўны універсітэт*
*культуры і мастацтваў*

# КАДРАВАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ БЕЛАРУСКІХ МУЗЕЯЎ (1770–1940)

У канцы XVIII ст. у Беларусі пачалі ствараецца першыя музеі пры навучальных установах. Яны былі даступныя больш шырокаму колу асоб, чым прыватныя калекцыі, што існавалі ў Беларусі з XVI ст. у маёнтках беларускіх магнатаў і заможнай шляхты.

Стваральнікамі музеяў пры навучальных установах былі выкладчыкі, якія мелі вышэйшую адукацыю. Калекцыі вызначаліся іх спецыялізацыяй. Беларуская музейная практыка XVIII ст. прадстаўлена вучоным-натуралістам Ж.Э.Жыліберам, якога кіраўнік гродзенскімі каралеўскімі эканоміямі ў ВКЛ А. Тызенгаўз запрасіў з Ліёна для наладжвання навучання і арганізацыі вучэбных прыродазнаўчых калекцый у адкрытай ім Гродзенскай медыцынскай школе, а затым акадэміі. Дзякуючы аўстрыйскаму вучонаму-энцыклапедысту Г.Груберу архітэктару, мастаку, пры Полацкай езуіцкай акадэміі былі арганізаваны прыродазнаўчы, навукова-тэхнічны і архітэктурны музеі.

У XIX ст. колькасць музеяў пры навучальных установах павялічылася. Як і ў XVIII ст., іх стваральнікамі і супрацоўнікамі (пры Віленскім універсітэце, Горы-Горацкай земляробчай школе, Полацкім кадэцкім корпусе, шматлікіх губернскіх гімназіях і настаўніцкіх семінарыях) з'яўляліся выкладчыкі названых універсітэта, школы, корпуса і інш. У XIX ст. вучэбныя музеі часцей за ўсё мелі прыродазнаўчы ці навукова-тэхнічны характар. Сустракаліся і гісторыка-этнаграфічныя музеі. Высокі навуковы ўзровень сабраных там калекцый дасягаўся за кошт прафесіяналізму іх арганізатараў. Можна ўзгадаць прафесараў І.Міцкевіча – заснавальніка кабінета фізікі Віленскага універсітэта, Л.Баянуса – арганізатара заалагічнага музея той жа навучальнай установы, прафесараў А.А.Война-Кудрынскага, І.А.Сцебута – арганізатараў музея пры Горы-Горацкай земляробчай школе, выкладчыкаў А.В.Русета, І.І.Даўгова, Л.Л.Кірпічова і іншых – арганізатараў і супрацоўнікаў археалагічнага музея Полацкага кадэцкага корпуса і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У сярэдзіне XIX – пачатку XX ст. з'яўляюцца музеі пры дзяржаўных установах (губернскіх статыстычных камітэтах, губернскіх палатах дзяржаўных маёмасцей і інш.), грамадскіх арганізацыях і аб'яднаннях (царкоўна-археалагічных камітэтах, архіўных камісіях і інш.). Ініцыятарамі стварэння такіх музеяў выступалі дзяржаўныя органы ўлады (у асобе губернатараў), навукоўцы і краязнаўцы. Іх адукацыя і навуковыя схільнасці ў шэрагу выпадкаў і вызначалі змест калекцый музеяў. Як правіла, стваральнікі музеяў мелі грунтоўную гісторыка-філалагічную адукацыю. Напрыклад, Д.І.Даўгяла ў час навучання ў Пецярбургскай духоўнай акадэміі спецыялізаваўся на айчыннай і царкоўнай гісторыі; А.П.Сапуноў скончыў гісторыка-філалагічны факультэт Пецярбургскага універсітэта, М.М.Багародскі вучыўся на гістарычным аддзяленні Маскоўскай духоўнай акадэміі і г.д.

Разам з тым у гісторыі беларускіх музеяў сустракаюцца выпадкі, калі ініцыятарамі і галоўнымі арганізатарамі шэрага музеяў у Беларусі выступалі асобы з гімназічнай адукацыяй, але значным вопытам даследчай дзейнасці. Перш за ўсё можна ўзгадаць стваральніка і папячыцеля Віленскага музея старажытнасцей, выпускніка Мінскай гімназіі Я.П.Тышкевіча, стваральніка музея пры Віцебскім статыстычным камітэце А.М.Семянтоўскага, што скончыў Нежынскі ліцэй, Е.Р.Раманава, які, маючы толькі гімназічную адукацыю, стварыў Віцебскі, Магілёўскі і Віленскі царкоўна-археалагічныя музеі.

На пасады супрацоўнікаў у тагачасныя музеі запрашалі спецыялістаў па той ці іншай профільнай для музея дысцыпліне. Так, у Віленскім музеі старажытнасцей кансерватарам у аддзеле археалогіі працаваў вядомы беларускі археолаг А.А.Плятар, прадоўжыў яго справу ў азначаным музеі археолаг Ф.В.Пакроўскі і інш.

У міжваенны перыяд сітуацыя ў БССР амаль не змянілася, хаця ў музейнай справе ў дачыненні да кадравага забеспячэння назіраліся дзве процілеглыя тэндэнцыі. З аднаго боку, у беларускіх музеях працавала пэўная колькасць асоб, якія мелі ці грунтоўны вопыт музейнай практыкі (напрыклад, А.Р.Брадоўскі, М.М.Багародскі, У.Г.Краснянскі і інш.), ці былі спецыялістамі ў той ці іншай навуковай галіне (А.М.Ляўданскі, археолаг; М.М.Філіповіч, мастак; В.Ю.Ластоўскі, этнограф і гісторык; П.В.Харламповіч, нумізмат, і інш.), а часцей за ўсё гэтыя якасці спалучаліся ў адной асобе. З другога боку, у канцы 1920-х – 1930-я гг. да супрацоўнікаў музеяў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прад'яўлялася адно важнае патрабаванне: яны павінны быць "вытрыманымі партыйцамі". Гэта было сведчаннем тых негатыўных і абыякавых адносін да музеяў, што пачалі складвацца ў другой палове 1920-х гг. Музеі разглядаліся як палітасветкамбінат, калі для супрацоўніка музея не было неабходнасці быць спецыялістам у профільнай дысцыпліне, важна было прытрымлівацца галоўнай лініі партыі. На пасады дырэктараў музеяў і навуковых супрацоўнікаў прызначалі асоб, якія ні па адукацыі, ні па вопыту работы не мелі дачынення да музейнай дзейнасці. Напрыклад, выпускнік Гомельскай саўпартшколы Я.М.Драпкін пэўны час займаў пасаду дырэктара Гомельскага аддзялення Беларускага дзяржаўнага музея (БДМ). На гэтай пасадзе яго змяніў былы кандуктар Закаўказскай чыгункі С.Т.Антонаў.

У канцы 1920-х – 1930-я гг. значную колькасць музейных супрацоўнікаў БССР рэпрэсіравалі. Гэта П.В.Харламповіч, В.Ю.Ластоўскі, С.А.Рак-Міхайлоўскі, С.М.Якубчык – усе яны ў свой час займалі пасаду дырэктара БДМ, А.В.Бурдзейка, супрацоўнік таго ж музея, М.М.Багародскі, В.В.Дабравольскі, Я.І.Васілевіч – супрацоўнікі Віцебскага аддзялення БДМ, І.А.Раманчук, А.А.Данільчык – у розныя часы былі дырэктарамі Музея рэвалюцыі ў Мінску і інш.

Неабходна адзначыць, што ў Беларусі на працягу разглядаемага перыяду не існавала сістэмы падрыхтоўкі музейных супрацоўнікаў. Навыкі прафесіі набываліся непасрэдна ў працэсе работы, і буйнейшыя тагачасныя музеі з'яўляліся школай падрыхтоўкі музейных спецыялістаў, перш за ўсё захавальнікаў. Тым не менш ужо ў канцы XIX – пачатку XX ст. у Расіі была асэнсавана неабходнасць падрыхтоўкі музейных кадраў, што выклікана ростам колькасці музеяў і вялікай увагай да праблем захавання, вывучэння і папулярызацыі нацыянальнай культурнай спадчыны. У Археалагічным інстытуце, створаным у 1907 г. у Маскве, чытаўся спецыяльны курс "Уводзіны ў музеязнаўства" (аўтар С.К.Кузняцоў) [9, с. 289]. У 1911 г. па ініцыятыве Віцебскай вучонай архіўнай камісіі было адкрыта Віцебскае аддзяленне згаданага інстытута. Праграма падрыхтоўкі была пэўным чынам скарэкціравана з улікам мясцовай спецыфікі. Выкладаліся такія навукі, як архівазнаўства і бібліятэказнаўства, але музеязнаўства не было [4, арк. 27]. Атрымліваецца, што кіраўніцтва Віцебскага аддзялення палічыла гэтую дысцыпліну непатрэбнай, хаця ў Віцебску, як і ў іншых гарадах Беларусі, у канцы XIX – пачатку XX ст. быў створаны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шэраг музеяў. Таксама можна адзначыць, што ў той жа час у вышэйшых навучальных установах выразны музейны ўхіл мелі лекцыйныя курсы і семінарскія заняткі па этнаграфіі і археалогіі.

Такім чынам, супрацоўнікі беларускіх музеяў у адзначаны перыяд былі пазбаўлены магчымасці атрымаць музеязнаўчую адукацыю, але былі спецыялістамі ў профільных для музея дысцыплінах: прыродазнаўстве, гісторыі і археалогіі, мастацтвазнаўстве і іншых, што з'яўляецца звычайным і для сучаснай музейнай практыкі.

З асаблівай вастрынёй праблема падрыхтоўкі музейных кадраў паўстала пасля 1917 г. Гэта было выклікана перш за ўсё значным ростам колькасці музеяў (асабліва ў правінцыі), эміграцыяй часткі музейных супрацоўнікаў, а ў далейшым – масавым адхіленнем ад музейнай дзейнасці нелаяльных да бальшавіцкай ідэалогіі асоб. Такая сітуацыя ў некаторай ступені характэрна і для БССР, дзе ў 1920-я гг. была створана значная колькасць музеяў, прычым большасць з іх складалі музеі краязнаўчыя. Таму пытанне аб падрыхтоўцы кваліфікаваных кадраў для музеяў было надзвычай злабадзённым і актуальным.

Так, на пасяджэннях музейнай рады Беларускага дзяржаўнага музея неаднаразова адзначалася неабходнасць падрыхтоўкі музейных спецыялістаў. Супрацоўнікі музея прапаноўвалі для большай эфектыўнасці вучнёўскіх экскурсій арганізоўваць для настаўнікаў спецыяльныя курсы.

У маі 1924 г. адбылася Першая ўсебеларуская нарада архівістаў, на якой уздымаліся пытанні падрыхтоўкі кадраў архівістаў. З дакладамі па гэтай праблематыцы выступалі рэктар БДУ У.І.Пічэта, былы кіраўнік Віцебскага аддзялення Маскоўскага археалагічнага інстытута Б.Р.Брэжга, старшыня Інбелкульта С.М.Некрашэвіч, намеснік загадчыка Цэнтрархіва М.В.Мялешка і загадчык апошняга З.Ф.Жылуновіч. З.Ф.Жылуновіч прапанаваў адкрыць не толькі архіўныя курсы пры БДУ, за якія выступаў У.І.Пічэта, але і музейна-бібліятэчныя [5, с. 44]. На падставе дакладаў У.І.Пічэты і Б.Р.Брэжгі была прынята рэзалюцыя: "Заслухаўшы даклады… нарада беларускіх архівістаў лічыць неабходным утварыць у бліжэйшыя часы курсы для падгатоўкі архіўных, музэйных і бібліатэчных працаўнікоў…" [5, с. 53]. Аднак прынятая рэзалюцыя ў дачыненні да музейных спецыялістаў не была рэалізавана.

Больш паспяховай аказалася спроба арганізацыі курсаў па краязнаўстве пры БДУ. Яны былі наладжаны ў 1927/28 акадэ-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мічным годзе. Слухачамі курсаў сталі аматары-краязнаўцы, якія, акрамя ўсебаковага вывучэння сваёй мясцовасці, павінны былі арганізоўваць радзімазнаўчыя музеі. Курс “Музеязнаўства і музеебудаўніцтва” чытаў тагачасны дырэктар БДМ і знакаміты беларускі навуковец В. Ю. Ластоўскі [1, с. 85]. Такім чынам выпускнікі курсаў атрымлівалі веды ў галіне музеязнаўства. Гэта быў першы вопыт падрыхтоўкі музейных кадраў. Аднак курсы праіснавалі вельмі непрацяглы перыяд. Да азначанай праблемы звярнуліся ў пачатку 1930-х гг. На Усебеларускай нарадзе музейных супрацоўнікаў у 1932 г. вырашылі адкрыць музейныя курсы пры Магілёўскім педагагічным тэхнікуме, а пастанова ЦК КП(б)Б патрабавала арганізаваць музейную спецыялізацыю ў БДУ і Вышэйшай партыйнай школе. Аднак сістэма падрыхтоўкі музейных кадраў так і не была створана.

Падводзячы вынік, адзначым, што ў разглядаемы перыяд музейныя кадры фарміраваліся са спецыялістаў у профільнай для музея навуковай сферы краязнаўцаў, якія набывалі навыкі музейнай прафесіі непасрэдна ў асяроддзі музея шляхам практычнага засваення назапашанага вопыту. Пашырэнне сеткі музеяў, ускладненне задач, што прад’яўляліся да іх, абумовілі неабходнасць атрымання музеязнаўчай адукацыі ў сістэме вышэйшай школы. Аднак у Беларусі працэс сістэматычнай і паслядоўнай падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне музейнай справы так і не быў наладжаны.

______________

1. *Аніхоўскі, А.* Праца Таварыства краязнаўства пры Беларускім дзяржаўным універсытэце ў 1927–28 / А.Аніхоўскі, В.Невядомскі // Наш край. – 1928. – № 6-7. – С. 79–86.

2. *Гужалоўскі, А.А.* Музеі Беларусі (1918–1941) / А.А.Гужалоўскі. – Мн.: НАРБ, 2002. – 176 с.

3. *Гужалоўскі, А.А.* Нараджэнне беларускага музея / А.А.Гужалоўскі. – Мн.: НАРБ, 2001. – 124 с.

4. *Нацыянальны* архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 249. – Воп. 2. – Спр. 162.

5. *Первая* всебелорусская конференция архивных работников, 12–15 мая 1924 г.: документы и материалы / сост. М.Ф.Шумейко. – Мн.: БелНИИДАД, 1999. – 148 с.

6. *Півавар, М.В.* Даследчыкі Полацка-Віцебскай даўніны / М.В.Півавар. – Віцебск: Віцеб. абл. друк., 2006. – 176 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

7. *Шибеко, З.* Из истории Витебских археологических курсов / З. Шибеко // Неман. – 1980. – № 6. – С. 188–190.

8. *Шумейко, М.Ф.* Подготовка историков-архивистов в Беларуси: история и современность / М.Ф.Шумейко // Архівознавство. Археографія. Джерелознавство: міжвідомчий наук. зб. – Вип. 5: Архіви – складова інформаційних ресурсів суспільства [Электронны рэсурс]. – Київ, 2002. – Рэжым доступу: http://www.archives.gov.ua/Publicat/Researches/ Materialy-confer_04.php.#Shumeyko. – Дата доступу: 11.11.09.

9. *Фролов, А.И.* Музееведческое образование / А.И.Фролов // Российская музейная энциклопедия: в 2 т. – М.: Прогресс: “РИПОЛ КЛАССИК”, 2001. – Т. 1. – С. 289–290.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ